навуковага вывучэння і фіксацыі лепшых яе ўзораў. Паказальна, што сярод цэнтраў і дамоў культуры актуальным стала не толькі захаванне этнаграфічных экспанатаў і занатоўванне фальклору, але і іх выкарыстанне ў сваёй дзейнасці. Падтрымкай дадзенай работы з'яўляецца правядзенне палявых даследаванняў на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях. Акрамя таго, варта наладзіць сістэму выяўлення і рэгістрацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Неабходна скаардзініраваць дзейнасць устаноў культуры Беларусі і навукова-практычных інстытутаў з мэтай збірання і класіфікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Задача сацыякультурнай установы (музея, дома рамёстваў, цэнтра культуры, бібліятэкі) – забяспечыць падтрыманне традыцыі і захаванне альбо аднаўленне механізмаў яе перадачы.

Надзвычай актуальнай задачай, якую таксама варта вырашыць установам культуры Рэспублікі Беларусь – вяртанне ў грамадскую памяць асэнсавання значнасці традыцыйнай культуры, напоўненасці яе асаблівым сэнсам. Адным з такіх механізмаў падтрымання традыцыі можа быць менавіта рэпрэзентацыя НКС, якая павінна ўключаць у сябе не толькі паказ традыцыйнай культуры, але і сродкі, і метады трансляцыі ўзораў этнічнай культуры беларусаў. У выпадку, калі традыцыйная культура не можа захавацца самастойна, у натуральным асяроддзі бытавання і функцыянавання, гэта павінна быць зроблена шляхам рэпрэзентацыі.

## ЛІТАРАТУРА


1.Магілёўшчына : [зб. арт. па археалогіі, гісторыі, краязнаўству] / Магілёўс. абл. краязн. музей. – Магілёў, 1992. – Вып. 3 / рэд. савет: В. М. Аненкаў, С. І. Бяспанскі, В. Ф. Капыцін. – 91 с.

2.Хмялькоў, А. «Event» на клубнай карце [Электронны рэсурс] / А. Хмялькоў // Культура. – Рэжым доступу: http://kimpress.by/index.phtml?page=2&id=2134. – Дата доступу: 28.08.2015.

3.Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь [Электронны рэсурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 9 ліп. 1999 г., № 282-З : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 20.05.2013 г. // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2015.

4.Городской методический центр отдела культуры Гомельского горисполкома [Электронный ресурс] // Гомельский городской исполнительный комитет. – Режим доступа: http://www.gorod.gomel.by/Culture/MetodicheskyCentr.aspx. – Дата доступа: 28.08.2015.

5.Государственное учреждение «Дворец культуры «Фестивальный» [Электронный ресурс] // Гомельский городской исполнительный комитет. – Режим доступа: http://www.gorod.gomel.by/Culture/dvoreckultury.aspx. – Дата доступа: 28.08.2015.

6.Культурнае жыццё ў аграгарадках / Віцеб. абл. метад. цэнтр нар. творчасці. – Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2010. – 12 с.

7.Учреждения культуры и искусства в Витебской области : стат. сб. / Витеб. обл. упр. статистики. – Витебск : ВОУС, 2003. – 96 с.

8.Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей [Электронны рэсурс] // Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал. – Рэжым доступу: http://www.gants-region.info/index/gudzevicki_dzjarzhawny_litaraturna_krajaznawchy_muzej/0-2223. – Дата доступу: 17.08.2015.

9.Дзейнасць рэгіянальных арганізацый культуры ў 2013 годзе / М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск : [б. в.], 2014. – 58 с.

10.Нематериальное культурное наследие. Мясцовая каштоўнасць – полька Спораўская [Электронный ресурс] // Березовский районный исполнительный комитет : офиц. сайт. – Режим доступа: http://www.bereza.gov.by/new_page_12_84. – Дата доступа: 28.08.2015.

11.Эстэтычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў ва ўстановах культуры рэспублікі: на прыкладзе вопыту работы ўстаноў культуры Бярозаўскага і Іванаўскага раёнаў Брэсцкай вобласці / Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры ; уклад. М. К.Дэмбоўская. – Мінск : БелДІПК, 2005. – 23 с.

12.Учреждения культуры и искусства Республики Беларусь : стат. сб. / М-во статистики и анализа Беларуси ; редкол.: В. С. Метеж (пред.) [и др.]. – Минск : Статиздат Минстата Беларуси, 2002. – 82 с.

13.Lukes, S. Émile Durkheim, his life and work: a historical and critical study / S. Lukes. – Harmondsworth : Penguin, 1975. – XI, 676 p.



***Лабачэўская В.А.***
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*


# І.А. СЕРБАЎ – ПЕРШЫ ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАСЦЮМА


*В статье на основе новых архивных материалов дана характеристика научной деятельности И.А. Сербова по собиранию, документации и изучению белорусского народного костюма в период 1910–1920-х годах. Утверждается, что ученый был первопроходцем в этой области и заложил основы для современных исследований.*

*On the basis of new archival materials the characteristic of scientific activity, I.A. Serbova of collecting, documentation and study of the Belarusian national costume during the 1910-1920-ies. It is alleged that the scientist was a pioneer in this field and laid the foundation for modern research.*

Ісак Абрамавіч Сербаў вядомы як этнограф, археолаг і фатограф, які ў 1911–1913 гг. выканаў на Беларусі серыю выдатных этнаграфічных фотаздымкаў. Гэтыя фота з'яўляюцца бясцэннымі дакументамі, якія сведчаць пра культуру беларусаў пачатку ХХ ст. напярэдадні разбуральных падзей Першай сусветнай вайны.

У ходзе апрацоўкі фотаздымкаў І. Сербава з калекцыі аддзела рукапісаў Бібліятэкі Вільнюсскага ўніверсітэта і падрыхтоўцы іх для публікацыі [Лабачэўская 2012], намі быў знойдзены шэраг архіўных дакументаў, якія адлюстроўваюць супрацоўніцтва этнографа з Паўночна-Заходнім аддзелам Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства (ІРГА) ў Вільні ў перыяд 1910–1914 гг., і яго працу ў Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт) з 1922 г. ў Мінску. У іх мы знаходзім шмат сведчанняў таго, што даследчык сярод іншых сваіх навуковых захапленняў мэтанакіравана вывучаў і збіраў народны касцюм беларусаў.

Пачатак навуковай і збіральніцкай дзейнасці І. Сербава па вывучэнні народнага касцюма звязаны з перыядам яго супрацоўніцтва з Мінскім царкоўна-археалагічным камітэтам, які быў створаны ў Мінску ў лютым 1908 г. Да дзейнасці камітэта І. Сербаў – настаўнік 2-й Мінскай мужчынскай гімназіі далучыўся ў 1910 г.. На выдаткаваныя яму камітэтам сродкі ён здзейсніў сваю першую этнаграфічную экспедыцыю на Палессе.

У "Записках Северо-Западного отдела Імператорского Русского географіческого общества» за 1910 г., знаходзім наступную інфармацыю аб дзейнасці Мінскага царкоўна-археалагічных камітэта і музея: "Камітэт цікавіцца і этнаграфіяй, хаця ў гэтым накірунку зроблена яшчэ не шмат: ёсць некалькі фатаграфічных здымкаў у жыхароў розных паветаў, сабрана некалькі дзясяткаў песень, запісана некалькі казак і паданняў, пакладзены пачатак калекцыянаванню мясцовых касцюмаў" [1, с. 233]. У зімку 1911 г. у выніку супрацоўніцтва з камітэтам І. Сербаў ажыццявіў яшчэ адну экспедыцыю па Мінскай губерні [2, с. 26]. З гэтай паездцы захаваліся зімовыя здымкі сялян вёсак Жыцін, Даманавічы і жыхароў яго роднай в. Кульшычы на Магілёўшчыне. У фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь налічваецца 7 фота І. Сербава са штампам Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта і 30 адбіткаў са штампам Мінскага царкоўна-археалагічнага музея. На 4 фота маецца аўтарскі штамп «Исаакій Абрамовіч Сербовъ».

Адсутнасць уласных сродкаў на этнаграфічныя паездкі і набыццё экспанатаў, перад усім народных строяў, прымусіла кіраўніцтва Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта звярнуцца да праўлення Рускага музея Імператара Аляксандра III ў Санкт-Пецярбурзе з прапанавай аб арганізацыі сумеснай працы. У звароце ад 27 мая 1911 г. за подпісам старшыні камітэта А. Снітко адзначана: "Мінскі царкоўна-археалагічны камітэт, акрамя іншага, паставіў сябе задачу сабраць калекцыю касцюмаў насельніцтва Мінскай губерні, а таксама набыць некаторыя прадметы, якія выходзяць ужо з ужытку ў сялян. Старасвецкія строі, плеценая збруя (напрыклад, з балотнай травы плеценая), лучнікі, розныя прылады на нашых вачах выціскаюцца фабрычнымі прадметамі. Усе пераЖыткі старажытнасці праз некалькі дзесяцігоддзяў беззваротна знікнуць" [РЭМ, ф. 1, воп. 2, сп. 770, арк. 1].

Камітэт прапанаваў аплаціць чатыры паездкі сваіх членаў па Мінскай губерні з мэтай набыцця для этнаграфічнаму аддзелу Рускага музея касцюмаў і іншых прадметаў, а за свой кошт меркаваў набываць дублеты для уласнага музея. У лісце адзначана, што "у асяроддзі членаў камітэта ёсць асобы, знаёмыя са справай збірання этнаграфічных калекцый". Каб пазнаёміць Рускі музей з тым, што ўжо было зроблена ў Мінску, да ліста прыкладаўся фотаздымак манекенаў. На фота, якое было выканана членам камітэта І. Сербавым, меліся выявы чатырох манекенаў, якія прадстаўлялі сялян Бабруйскага павета – "сакуноў" і пяць дзяўчат з-пад Слуцка, верагодна з вёсак "выбранцаў". З гэта можна заключыць, што гэтыя манекены, апранутыя ў традыцыйныя строі, экспанаваліся ў Мінскім царкоўна-археалагічным музеі. Не выклікае сумнення, што ўзоры народнага адзення былі прывезены І. Сербавым з яго экспедыцый. Прапанова, зробленая Мінскім царкоўна-археалагічным камітэтам праўленню Рускага музея па арганізацыі сумесных экспедыцый для набыцця экспанатаў, хутчэй за ўсё была разлічаная на непасрэдны ўдзел у іх менавіта І. Сербава. Пакуль застаецца невядомым, ці адбылося такае супрацоўніцтва.

У 1910 г. І. Сербава стаў сябрам узноўленага ў Вільні Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ. Даследчыку пашчасціла найбольш плённа рэалізаваць праграму аддзела па зборы этнаграфічных матэрыялаў. Секцыю этнаграфіі і археалогіі аддзела ўзначаліў вядомы этнограф Е. Раманаў, які ў сваём нарысе аб матэрыяльнай культуры "Внешний быт быховского беларуса" пісаў: "Цяпер патрыярхальны да таго часу быт беларуса з неймавернай хуткасцю пачаў паддавацца зменам. Адбылося гэта неяк незаўважна, аднак паўсюдна, і пачалося з касцюма. [...] Селянін атрымаў магчымасць звольніць сябе ад доўгай і цяжкай працы па вырабе палатна і сукна і стаў набываць на бялізну і адзенне танны паркаль, бумазею, вырабы лодзінскай фабрыкі, замяніў лапці скураным абуткам. [...] І вось, цяпер трэба

спяшацца з апісаннем народнага побыту, інакш нівеліруючая рука часу хутка згладзіць усе асаблівасці народнага жыцця, а пакаленні этнографаў, якія прыдуць нам на змену, ужо не знойдуць у ёй нацыянальных рыс" [3, с. 75–76].

Тры гады запар з 1911 па 1913 гг. І. Сербаў атрымліваў субсідзіраванне ад Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ на свае этнаграфічна-фатаграфічныя вандроўкі, як ён іх называў, па Беларусі. У справаздачах даследчык сярод іншага рэгулярна даводзіў да аддзела, што традыцыйнае адзенне знікае, і заклікаў пасляшацца са складаннем калекцыі найбольш тыповых народных строяў, якія дажываюць свае апошнія дні і якія можна сустрэць ужо толькі ў старых людзей у самых глухіх і закінутых кутках Палесся [VBU RS, F 34, b. 716, l. 26].

У справаздачах і працах на матэрыялах экспедыцый І. Сербаў падрабязна апісвае народныя строі жыхароў розных куткоў Беларусі. Варта прывесці вытрымкі з яго не надрукаванага нарыса "Дрэгва" 1912 г., у якім апісаны традыцыйны касцюм палешукоў: "У адзенні таксама заўважаецца вялікая разнастайнасць. Разам з беларускімі світкамі сустракаецца маларуская "юбка" (маларускі кафтан са зборкамі на паясніце). Паўсюль белая валёнка чаргуецца з капелюшам, якія мае шырокія палі. Усюды захавалася яшчэ нацыянальная дрэгавіцкая намітка, стракаты тканы пояс з калітой і шабетай і адкрыты лапаць". [...] Палешукі дасюль захавалі сваё нацыянальнае дрэгавіцкае адзенне, абутак і галаўныя ўборы. Ад Заходняга Буга да Дняпра паўсюль у глухамані можна сустрэць белую світку "з вусамі" і намітку. Аднак скураную вялікую каліту палешукі (на Верхнем Палессі – *заўв. аўтара*) носяць не на поясе, а праз плячо на перадзе" [VBU RS, F 3, b. 260, 1. 56,120].

У давыд-гародоцкіх жанчын ён адзначыў своеасаблівы галаўны ўбор: нізкая павязка хусткі з махрамі, якія апускаюцца на вочы, ці высокая кібалка з лямцу, пакрытая рэдзенькай шырынкай" [VBU RS, F 3, b. 260, l. 157]. Слуцкія "выбранцы", мужчыны і жанчыны, носяць амаль аднолькавага крою шэрыя курткі са зборкамі на таліі. Не зважаючы на блізкасць горада, жанчыны і дзяўчыны тут не развітваюцца са сваімі старадаўнімі строямі: "Яны носяць андарак і прыгожую, каляровую безрукаўку, а на галаву павязваюць вялікую хустку з доўгімі махрамі у выглядзе пышнага цюрбана. Гэты касцюм вельмі прыгожы і значна пашыраны на слуцкіх Палях". Суседнія з "выбранцамі" жыхары мястэчка Семежава, як прымеціў даследчык, захавалі сваю кароценькую шэранькую куртачку, а "на Навагрудскіх Палях там-сям яшчэ застаўся прыгожы, гэтак званы шчорсаўскі касцюм: белая світка "з вусамі" і прарэхамі па баках, каляровая шнуроўка, а на галаве – вялікая хустка, якая павязаная цюрбанам" [VBU RS, F 3, b. 260, l. 51]. Аб традыцыйных палескіх строях у справаздачы па экспедыцыі 1913 г. этнограф пісаў наступнае: "Крой адзення, завіванне наміткі і размяшчэнне ўзораў на рубашках амаль у кожным раёне маюць свае адрозныя асаблівасці, якія цалкам выразна аддзяляюць адну мясцовасць ад другой. Асаблівай стыльнасцю адрозніваецца жаночы галаўны ўбор у Кажан-Гарадку, Азарычах, ў Св. Волі, Бездзежы і Янаве" [VBU RS, F 34, b. 659, l. 20].

Ва ўсіх этнаграфічных вандроўках І. Сербаў рабіў фотаздымкі. Аналіз выбраных для фатаграфавання тыпаў, кампазіцыі здымкаў і абраныя ракурсы сведчаць пра творчыя адносіны этнографа да сваёй справы. Ён здымае сваіх герояў у строях, якія былі яшчэ ва ўжытку, або просіць іх апранаць старадаўняе адзенне. Фіксуе ён таксама і новыя модныя строі, якія ў той час пачала насіць моладзь. Згодна з рэкамендацыямі па фатаграфавання касцюма, распрацаванымі Паўночна-Заходнім аддзелам ІРГА, этнограф, выконвае здымкі людзей у строях у фас, профіль, ў тры чвэрці, каб паказаць асаблівасці адзення і галаўных убораў са ўсіх бакоў. Класікай мастацтва этнаграфічнай фатаграфіі з'яўляюцца серыі фатаграфічных выяў жанчын у традыцыйных строях з Турава і Дывыд-Гарадка, выбранскіх вёсак пад Слуцкам, Дражына (Старадарожскі раён), Васілевічы і Вялікі Аўцюкі (Калінкавіцкі раён), Радчыцк (Столінскі раён), Пінкавічы (Пінскі раён) і інш.

У агульнай справаздачы Паўночна-Заходняга аддзела ІРГТ за 1913 г былі высока ацэнены вынікі летняй двухмесячнай паездкі І. Сербава па Палессі і зазначана вялікая каштоўнасці яго фотаздымкаў на той падставе, што "многія з фатаграфаваных касцюмаў і галаўных убораў цяпер складаюць вялікую рэдкасць, бо яны ўжо даўно выйшлі з моды і захоўваюцца толькі старымі ў якасці "смярётнага" адзення" [VBU RS, F 34, b. 714, l. 10].

На гадавым сходзе аддзела ў Вільні 30 мая 1914 г. было вырашана стварыць пры аддзеле этнаграфічны музей. У пастанове сходу было запісана: "Прымаючы да ўвагі настойлівую неабходнасць, якая засведчана ў гадавой справаздачы, неадкладна прыступіць да стварэння пры аддзеле этнаграфічнага музея ў сувязі з поўным знікненнем па назіранню цягам апошніх трох гадоў сябры аддзела І.А. Сербава тыповых народных касцюмаў". Сход аддзела пастанавіў хадайнічаць перад праўленнем ІРГТ ў Маскве аб асігнаванні 500 рублёў на мэты "састаўлення калекцыі народных строяў Палесся і выраб манекенаў для іх экспанавання" [VBU RS, F 34, b. 715, l. 2.]. Меркавалася у першы год стварыць калекцыю з 10

манекенаў Выдаткі на чарговую камандзіроўку І. Сербава на Палессе аддзел вырашыў прыняць на ўласны кошт [VBU RS, F 34, b. 716, l. 27].

Невядома ці адбылася летам 1914 г. чарговая паездка этнографа на Палессе. Ажыццявіць гэты праект, які прадугледжваў стварэнне музея народных строяў пры Паўночна-Заходнім аддзеле ІРГА, перашкодзіла Першая сусветная вайна і набліжэнне фронту ў 1915 г. да Вільні.

Наступны перыяд навуковай дзейнасці І. Сербава звязаны з Мінскам, дзе ён выкладаў этнаграфію ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і працаваў у Інбелкульце, з 1929 г. – ў Акадэміі навук БССР. Дакументы архіва Інбелкульта, рэшта якога ацалела ў вайну, сведчаць пра тое, што даследчык сярод іншых сваіх этнаграфічных і археалагічных захапленняў, працягваў навуковую працу па даследаванні беларускага народнага адзення.

У 1927 г. І. Сербаў узначаліў камісію па вывучэнні быту і матэрыяльнай культуры пры катэдры этналогіі Інбелкульта. Стварэнне асобай камісіі было абумоўлена ясным разуменнем таго, што матэрыяльная культура беларусаў вывучана недастаткова. У дакументах катэдры этналогіі адзначалася: “Матэрыяльная культура, у параўнанні з іншымі галінамі этнаграфіі, вельмі слаба вывучана, як з боку яе паступовага развіцця, так і з боку тэхнікі вырабаў і ўжывання прадметаў культуры. Літаратурныя крыніцы, музейныя экспанаты і сабраныя на месцах запісы і зарысоўкі не поўнасцю выясняюць закранутыя пытанні” [ЦНА НАН РБ, фонд 67, воп. 1, спр.22, арк. 58–59].

У адпаведнасці з планам працы катэдры этналогіі на 1927 г. на І. Сербава ўскладаліся наступныя абавязкі: прывесці ў сістэму і апрацаваць сабраныя за мінулыя гады матэрыялы ў фатаграфічных картках, чарцяжах, зарысоўках з належным тэкстам да іх, скласці альбом з 1000 фотаздымкаў матэрыяльнай культуры, які былі сабраныя даследчыкам у папярэднія гады, і злажыць манаграфічны нарыс беларускай народнай вопраткі. У 1928 г. ён павінен быў завершыць для друку даследаванне пад назвай: “Прычоска і галаўныя уборы беларускага народу” аб’ёмам 10 аркушаў [ЦНА НАН РБ, ф. 67, воп. 1, спр. 22, арк. 59]. У іншым дакуменце гэтая праца мае назву «Беларускія старажытныя галаўныя ўборы» [ЦНА НАН РБ, ф. 67, воп. 1, спр. 22, арк. 104]. Можна меркаваць, што ў манаграфічным даследаванні І. Сербаў меўся абагульніць багатыя матэрыялы па галаўных уборах беларусаў, якія збіраў падчас сваіх экспедыцый і якія добра адлюстраваныя на яго этнаграфічных фотаздымках. Аналіз звестак аб галаўных уборах, якія змешчаныя ў яго справаздачах і працах, сведчыць пра тое, што этнограф уважліва апісваў асаблівасці іх формы, колер, канструкцыю, памер, дэталі. Каштоўнымі з’яўляюцца ўдакладненні пра полаўзроставую прыналежнасць розных відаў пакрыцця галавы ў жанчын, адзначэнні відаў галаўных ўбораў жанчын розных сацыяльных станаў – сялянак, шляхцянак і мяшчанак.

Напрыклад, асобны раздзел прысвечаны галаўным уборам у справаздачы І. Сербава па экспедыцыі на Палессе 1911 г. Мужчынскую магерку – лямцавую ці суконную, з нізкімі і загнутымі ўверх палямі – “крысамі”, даследчык называе “нацыянальнай шапкай”. У якасці зімовага галаўнога ўбору палешукоў ён адзначае шапку з белай аўчыны з чатырохвугольным суконным верхам [4, с. 307]. Падрабязна апісаны ім разнастайныя галаўныя ўборы жанчын і стан іх ўжывання. Так даведваемся, што напярэдадні Першай сусветнай вайны, намітку насілі старыя жанчыны пад Слуцкам ў выбранскіх вёсках, шляхцянкі ў в. Мядзведавічы, старухі-мяшчанкі в. Плотніца на Піншчыне. Нізкім цюрбанам яе павязвалі ў палескіх вёсках Хатынічы (Ганцавічскі раён). У раёна Любешоўскага раёна Мінскай губерні (цяпер Валынская вобласць, Украіна) этнограф адзначыў “шмат розных павязак намітак” – спосабаў завязвання гэтага галаўнога ўбору. У в. Барысавічы на Мазыршчыне намітка захоўвалася толькі ў самых старых жанчын. У Давыд-Гарадку даследчыку давялося сфатаграфаваць унікальны стaрадаўні галаўны убор жанчын – “святочную высокую кібалку”. Маладзіцы ў в. Пінкавічы пад Пінскам насілі “прыгожы какетлівы чапец-кібалку”. На тэрыторыі сучаснага Калінкавічскага раёна І. Сербаў заўважыў, што намітку насілі толькі старыя жанчыны, а маладзіцы ўжо даўно замянілі павязкай з лёгкага палатна з карункавай аздобай, якая завязваецца накшталт колішняй дзявочай хусты – шырынкі. Асаблівы каларыт мясцовасці ў раёне вёсак Целядавічы і Пясочна (Капыльскі раён), ад Слуцка да Грыцэвіч (Клецкі раён) надаваў галаўны ўбор старых і маладых жанчын ў форме каптура чырвонага колеру, які меў назву “дзцел”.

Даследчык звяртаў увагу таксама на асаблівасці жаночых прычосак. Ён апісаў, што жанчыны ў вёсках сакуноў (Старадарожскі раён) завіваюць валасы на макушцы на драўляны ці лубяны абадок– бячэйку 4,4–6,6 см у вышыню, а паверх надзяваюць вязаны з нітак чапец і намітку. Дзяўчаты заплятаюць касу і павязваюць галаву даўняй “шырынкай” – тонкім ручніковым галаўным уборам з вышытымі канцамі [5, с. 23–25]. У Любешоўскім раёне (Украіна) І. Сербаў адзначыў звычай, калі замужняя жанчына абрэзала сваю дзявочую касу і насіла стрыжаныя валасы, як мужчыны [6, с. 95]. Разам з тым даследчык неаднаразова падкрэсліваў, што старадаўняе адзенне і галаўныя ўборы замяняюцца на модныя гарадскія, моладзь робіць модныя прычоскі, белая світка змяняцца піджаком, магерка – картузам, намітка – хусткай.

І. Сербаву не ўдалася рэалізаваць свае планы па падрыхтоўцы выдання, прысвечанага беларускім традыцыйным галаўным уборам. Разам з тым, зробленыя ім на пачатку ХХ ст. этнаграфічныя апісанні і экспедыцыйныя фотаздымкі, ўяўляюць для сучасных даследчыкаў бясцэнны навуковы матэрыял па беларускаму касцюму і ў прыватнасці – галаўным уборам.

З запланаваных да друку манаграфій І. Сербава ў 1927 г. ўбачыла свет толькі яго праца "Вічынскія паляне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся" [75]. Не захаваліся рукапісы яго даследаванняў па народнаму касцюму, які, верагодна, былі знішчаны разам з архівам і музейнымі зборамі Інбелкульта і матэрыяламі асабістага архіва даследчыка ў Мінску.

Падзвіжніцкая навуковая дзейнасць І. Сербава і вялізны, не гледзячы на незаменныя старты, аб'ём унікальных этнаграфічных матэрыялаў, які быў сабраны ім, ажыццяўленне праектаў па рупліваму збіранню народных строяў, што імкліва адыходзілі ў нябыт, непасрэдны ўздел у запачаткаванні першых музейных збораў, дзе хараство і разнастайнасць традыцыйнага касцюма беларусаў былі ўпершыню прадстаўлены грамадскасці, дазваляе па праву назваць яго першым даследчыкам гэтай выдатнай галіны беларускага культуры і народнага мастацтва. Увядзенне новых архіўных матэрыялаў дазваляе ацаніць маштаб асобы І. Сербава і значэнне яго навуковай дзейнасці па збіранні і вывучэнні народнага адзення. Навуковая спадчына вучонага заклала трывалы падмурак для сучасных даследаванняў беларускага народнага касцюма.

## ЛІТАРАТУРА


1. Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 1. – Вильна, 1910. – 300 с.
2. Лабачэўская, В.А. Беларусы у фотаздымках Ісака Сербава 1911–1912 гадоў = The Belarusians in the photos of by Isaac Serbau = Baltarusiai Isako Serbovo metų fotografijose / В.А. Лабачэўская // / склад., аўт. уступ. артыкула В.А. Лабачэўская; рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. Імя П. Броўкі, 2012. – 456 с. : іл. – (Энцыклапедыя рарытэтаў)
3. Романов, Е. Р. Внешний быт Быховского белоруса / Е.Р. Романов // Записки Северо-Западного отдела Русского географического общества. – Вильна, 1911. – Кн. 2. – С. 75–102.
4. Сербов И.А. По Дреговичской области летом 1911 г. // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 3. – Вильна, 1912. – С. 304 – 320.
5. Сербов, И.А. Белорусы – сакуны / И.А. Сербов // Сб. отделения рус. языка и словесности Импер. Акад. Наук. – Петраград, 1915. – Т. XCIV, № 1. – С. 1–49.
6. Сербов, И.А. Поездка по Полесью летом 1912 г. / И.А. Сербов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 4. – Вильна, 1914. – С. 70–102.
7. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І.А. Сербаў / прадм. Т.А. Наваградскі, Я.А. Пясоцкая. Мінск: БФК, 2005. – 88 с.

Архіўныя крыніцы

РЭМ – Навуковы архіў Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбурзе (Расія)

ЦНА АН Беларуси – Центральный научный архив Академии наук Беларуси

VBU RS – Отдел рукописей Библиотеки Вильнюсского университета / Rankraљių skyrius Vilniaus Universiteto Biblioteka (Літва)



***Сапотько П.М.***

*(Республика Беларусь, г. Минск)*


# ВОЛОНТЕРСКИЕ ПРОГРАММЫ ПО РЕПРЕЗЕНТАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛАРУСИ


*Волонтерство в XXI веке приобретает значение важного феномена, представляющего собой актуальный инструмент развития сферы культуры. В частности, в Беларуси многие волонтерские программы направлены на возрождение, сохранение и популяризацию материального историко-культурного наследия, которым богата наша страна. Существуют успешные практики взаимодействия государственных и общественных институтов, подкрепленные составляющей волонтерской деятельности, благодаря чему происходит важный процесс репрезентации национального достояния страны как одного из основных ресурсов социально-культурной устойчивости и фактора укрепления культурного имиджа Беларуси.*

*Volunteering in the XXI century takes on significance as an important phenomenon, which is the relevant instrument of cultural development. In particular, in Belarus, many volunteer programs aimed at the revival, preservation and promotion of tangible historical and cultural heritage, which is rich in our country. There are good practices of interaction of state and public institutions, supported by part of volunteer activities, so there is an important process of representation of the national heritage of the country as one of the main resources of social and cultural sustainability and a factor strengthening the cultural image of Belarus.*